10. *Львов М. Р.* Словарь-справочник по методике русского языка. – М.: Просвещение, 1988. – 240 с.

11. *Мілавідава Б.* Узбагачэнне слоўніка вучняў // Настаўніцкая газ. – 1952. – 20 сак.

12. *Основы* методики русского языка в 4–8 классах / Под ред. А. В. Текучева. – М.: Просвещение, 1978. – 382 с.

13. *Падгайскі Л. П.* Узбагачэнне і актывізацыя слоўніка вучняў // Нар. асвета. – 1974. – № 2. – С. 44–49.

14. *Самцэвіч В. А.* Асаблівасці ў рабоце над беларускім слоўнікам у рускай школе // Настаўніцкая газ. – 1951. – 16 жн.

15. *Текучев А. В.* Методика русского языка в средней школе. – М.: Просвещение, 1980. – 414 с.

16. *Шчыракоў Н.* Важны від слоўнікавай работы // Нар. асвета. – 1962. – № 7. – С. 7–9.

17. *Яленскі М. Г.* Шляхі станаўлення і развіцця методыкі беларускай мовы (30-я гады) // Бел. мова і літ. у шк. – 1990. – № 3. – С. 5–9.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Л.Ф.Голікава,** *дацэнт*

# ЗНАЧЭННЕ КУРСА «АСНОВЫ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ РАБОТЫ» Ў ПРАФЕСІЙНАЙ ПАДРЫХТОЎЦЫ СТУДЭНТАЎ РЭЖЫСЁРСКАЙ СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫІ

У пачатку XXI ст. перад выкладчыкамі вышэйшай школы, як ніколі раней, паўстае праблема выпрацоўкі аптымальных патрабаванняў да ўзроўню падрыхтоўкі будучых спецыялістаў, асабліва ў галіне мастацтва. У творчых навучальных установах Беларусі, у тым ліку і ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры, у сувязі з гэтым актуальнай і перспектыўнай аказваецца распрацоўка методыкі сучаснай канцэпцыі навучання. У сістэму мастацкай адукацыі арганічна ўключаюцца дысцыпліны, якія садзейнічаюць раскрыццю творчага патэнцыялу студэнта і

арыентуюць навучэнца на канчатковы вынік у авалоданні прафесіяй.

Да падобнага роду вучэбных дысцыплін можна, безумоўна, аднесці спецкурс «Асновы навукова-даследчай работы», які ў сукупнасці з шэрагам практычных і тэарэтычных спецпрадметаў – рэжысурай, акцёрскім майстэрствам, сцэнічнай мовай, музыкай у спектаклі, тэорыяй драмы, тэатральнай крытыкай і іншымі – садзейнічае падрыхтоўцы рэжысёра – высокакваліфікаванага спецыяліста, прыстасаванага і да творчай, і да педагагічнай, і да навукова-даследчай дзейнасці. Будучы рэжысёр – гэта асоба, якой уласцівы «творчая самастойнасць, арганізатарскія здольнасці, педагагічнае майстэрства... адным словам, гэта павінен быць спецыяліст шырокіх творчых магчымасцей, які можа лёгка адаптавацца да любых абставінаў» [1]. Як падкрэсліваў К.Станіслаўскі, будучы рэжысёр «павінен паклапаціцца аб сваёй адукацыі і выхаванні», паколькі для таго, каб «вытлумачыць творы геніяў, трэба іх тонка адчуваць і разумець, а каб разумець іх, трэба быць адукаваным чалавекам» [2, с.525]. І ў гэтым сэнсе вывучэнне спецкурса «Асновы навукова-даследчай работы» дае магчымасць студэнту пашырыць свой кругагляд, пераадолець баязлівасць перад новым, не падобным да творчых дысцыплін, прадметам.

Як вядома, веды і ўменні будучага спецыяліста-рэжысёра фарміруюць некалькі блокаў дысцыплін – гуманітарных, сацыяльных, агульнанавуковых і агульнапрафесійных, спецыяльных і дысцыплін спецыялізацый, сярод якіх вышэйадзначаны спецкурс займае даволі значнае месца, дазваляе студэнту азнаёміцца, а потым і непасрэдна сутыкнуцца з методыкай і метадамі правядзення навукова-даследчай работы. Дзякуючы знаёмству з асновамі навуковай працы, будучы рэжысёр набывае ўменні не толькі асэнсоўваць тэатральныя творы, аналізаваць іх, але і свабодна выказваць свае думкі ў пісьмовай форме, правільна іх фіксаваць, працаваць з навуковай літаратурай і інш. У студэнта паступова выпрацоўваюцца навыкі навукова-даследчай работы, фарміруецца асоба маладога вучонага. Тут дарэчы будзе прывесці выказванне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэжысёра-практыка і педагога М.Абрамава, які адзначаў: «На мой погляд, **навучыць** нельга нічому, а вось **навучыцца** (вылучана мной. – *Л.Г.*) можна вельмі многаму» [3].

Зразумела, не абавязкова, каб усе студэнты праяўлялі схільнасць да навуковай дзейнасці (ды і не ў гэтым заключаюцца мэта і задачы дадзенага спецкурса). Але даць навучэнцу магчымасць паспрабаваць сябе ў новай якасці, паспрабаваць асэнсаваць новы від дзейнасці цалкам адпавядае духу часу і ўвогуле дастаткова перспектыўна, тым больш што падобная дзейнасць садзейнічае выпрацоўцы «звышасэнсаванай арганічнай творчасці» [2, с.278].

Як вядома, рэжысёр, шырэй – рэжысёр-педагог, – прафесія, якая абавязвае да многага. Яна патрабуе ўвагі да мастацтва ва ўсіх яго відах і жанравай разнастайнасці, фарміруе ўстойлівы інтарэс да кніг па мастацтве (і не толькі тэатральным), садзейнічае развіццю прафесійных навыкаў у абранай галіне мастацтва (рэжысуры, тэатральнай творчасці). Не падлягае сумненню, што вывучэнне спецкурса «Асновы навукова-даследчай работы» садзейнічае найбольшай эфектыўнасці навучання і пазнання, вызначае якасную падрыхтоўку спецыяліста. «Не існуе мастацтва, якое не патрабавала б віртуознасці (у дадзеным выпадку – віртуознасці авалодання ўсім комплексам прафесійна-развіваючых дысцыплін. – *Л.Г.*), і не існуе канчатковай меры для паўнаты гэтай віртуознасці», – адзначаў К.Станіслаўскі [2, с.275].

Трэба падкрэсліць, што ў галіне тэатральнага мастацтва пытанні прафесійнай адукацыі, праблемы выхавання рэжысёра неаднаразова ўздымаліся ў працах К.Станіслаўскага, а таксама Б.Пакроўскага, С.Гарчакова і іншых выдатных тэатральных дзеячаў. Аднак, нягледзячы на акцэнты, якія расстаўляліся ў публікацыях на дадзеную тэму (як падкрэсліваў К.Станіслаўскі, «кожная дзейнасць толькі тады добрая і важная, калі яна з'яўляецца вынікам якой-небудзь ідэі» [2, с.588]), у тэатральнай педагагічнай практыцы засваенне асноў даследчай навуковай працы як спецыяльны курс практычна адсутнічае. На кафедры тэатральнай творчасці яму адводзіцца толькі 28 гадзін.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У межах гэтага курса разглядаюцца такія пытанні, як асновы навукова-даследчай дзейнасці, яе сутнасць; методыка працы з літаратурнымі першакрыніцамі; уменне сістэматызаваць рабочы матэрыял; авалоданне культурай бібліяграфічнага цытавання; тэхналогія навучання асновам навукова-даследчай (навукова-творчай) работы; этапы дзейнасці даследчыка. Да шэрага пытанняў можна аднесці таксама тыя з іх, што звязаны з уменнямі структураваць навукова-даследчую (навукова-творчую) работу; авалоданнем методыкай работы над навуковым тэкстам, вызначэннем тыпалагічных параметраў тэксту. Пры засваенні курса асаблівая ўвага звяртаецца на афармленне дадатковых матэрыялаў: ілюстрацый, малюнкаў, схем і іншага, парадак іх выкарыстання ў навукова-творчай рабоце. Разглядаюцца тэхнічныя патрабаванні да афармлення навуковай (навукова-творчай) работы, вынікам становіцца напісанне аднаго з раздзелаў работы.

Дадзены курс садзейнічае актывізацыі перш за ўсё разумовай дзейнасці студэнта, а таксама яго валявых якасцей, гэта значыць, дазваляе сфарміраваць мастацка-навуковае мысленне будучага рэжысёра, бо «розум, воля, пачуццё складаюць непадзельны трыумвірат, кожны член якога аднолькава важны у працэсе творчасці» [2, с.519]. Такім чынам, узаемасувязь творчасці і тэорыі, пачуцця, эмоцый (асновы творчага працэсу) і розуму (здольнага гэты працэс раскрыць) ёсць два бакі адзінага шляху прафесійнага навучання, які садзейнічае набыццю студэнтам навыкаў і уменняў мысліць навукова. Такім чынам, засваенне спецкурса аказваецца адной з дзейсных формаў развіцця ў студэнтаў імкнення не толькі да самастойнага навуковага мыслення, але і выпрацоўкі актыўнага інтарэсу да навукова-даследчай ці навукова-творчай работы. На такіх занятках студэнты вучацца суадносіць веды, атрыманыя ў працэсе вывучэння спецыяльнай навуковай і вучэбнай літаратуры, з навыкамі і ўменнямі творчага характару.

Спецкурс «Асновы навукова-даследчай работы» займае сваю «нішу» ў працэсе падрыхтоўкі будучых спецыялістаў-рэжысёраў і садзейнічае якаснаму засваенню імі практычных спецыяльных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дысцыплін. Як заўважыў К.Станіслаўскі, сапраўднаму прафесіяналу «неабходны шырокія навуковыя і літаратурныя веды <…> дапытлівы розум, які аналізуе і расчляняе творчасць» [2, с.343], хаця, гаворачы словамі таго ж творцы знакамітай сістэмы, «выказваць думкі – гэта яшчэ не значыць тварыць» [2, с.345].

---

1. *Смольскі Р.* Сучаснае рэжысёрскае мастацтва Беларусі: праблемы развіцця ў новых гістарычных вымярэннях // Сучасная беларуская рэжысура. Пошукі мастацкай адметнасці ў кантэксце традыцый еўрапейскага тэатра: Зб. матэрыялаў міжнар. навук.-творч. канф. (Мінск, 16–17 кастр. 1997 г.). – Мн.: Арты-Фэкс, 1998. – С. 38.

2. *Станиславский К.* Мое гражданское служение России. – М.: Правда, 1990.

3. *Абрамов М.* О режиссерской профессии // Сучасная беларуская рэжысура. Пошукі мастацкай адметнасці ў кантэксце традыцый еўрапейскага тэатра: Зб. матэрыялаў міжнар. навук.-творчай канф. (Мінск, 16–17 кастр. 1997 г.). – Мн.: Арты-Фэкс, 1998. – С.100.

**Н.І.Гуд,** *ст. выкладчык*

## РАБОТА З ЛЮДЗЬМІ СТАЛАГА ЎЗРОСТУ ЯК САЦЫЯЛЬНАЯ ПРАБЛЕМА

Адносіны грамадства да праблем старэння адлюстроўваюць пазіцыю дзяржавы да пажылых людзей.

Гістарычныя даследаванні сведчаць, што першы закон аб адказнасці дзяржавы за нямоглых і немаёмных старых людзей быў прыняты ў Англіі ў 1601 г. А ў канцы XVII – пачатку XVIII ст. адзначаецца тэндэнцыя да арганізацыі дамоў састарэлых, выплаты пенсій па старасці і інш. Але сацыяльны аспект старэння прадме-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ